прыкметна нацыянальная спецыфічнасць на ўзроўні аўтарскага стылю, чым нацыянальна-стадыяльнага.

Занько А.Р.,
ст.выкладчык

## РОК-МУЗЫКА БЕЛАРУСІ (80-Я ГАДЫ)

Рок-музыка – адна з найбольш яскравых з'яў папулярнай музыкі XX ст., якая ўзнікла ў сярэдзіне 50-х гадоў. Вытокі рок-музыкі звязаны з негрыцянскімі музычнымі традыцыямі. Першыя найбольш закончаныя ўзоры рока сфарміраваны ў ЗША і Англіі. Яны былі звязаны з творчасцю Боба Дылана і «Beatles», якія паклалі пачатак шматлікім разнавіднасцям рок-музыкі.

Характэрнай асаблівасцю рок-музыкі з'яўляецца яе масавасць, асабліва сярод моладзі. Ва ўсім свеце ствараецца вялікая колькасць гуртоў, якія імправізуюць у духу рок-музыкі. Гэта з'ява не абышла інструментальны жанр. У сярэдзіне 60-х гадоў узнікаюць шматлікія вакальна-інструментальныя ансамблі, якія па некаторых стылявых і жанравых прыкметах выяўляюць роднасць з рок-гуртамі. Тыя ж самыя інструменты, гукаўзмацняльная апаратура, выкарыстанне асцінатнай рытмікі і г.д. Аднак пры ўсёй агульнасці яны маюць глыбокія, прынцыповыя адрозненні. Вакальна-інструментальныя ансамблі абапіраліся на традыцыі беларускай масавай і эстраднай песні і на яе аснове выкарыстоўвалі народны фальклор. Найбольш яскравымі прадстаўнікамі гэтага напрамку з'явіліся «Песняры».

У пачатку 70-х гадоў на Беларусі з'яўляюцца гурты, якія ў сваёй творчасці абапіраюцца на стылявыя асаблівасці рок-музыкі. У 1977 г. ствараецца рок-гурт «Сузор'е», які выконвае музыку ў стылі хард-рока. Перш чым выйсці на прафесійную сцэну, гэты гурт стаў уладальнікам галоўнага прыза Рыжскага фестывалю. А ў 1981 г. стаў дыпламантам міжнароднага конкурсу «Крымскія зоры». У 1988 г. на фірме «Мелодыя» выходзіць першы дыск гурту пад назвай «Срэбраная рака». У яго аснову пакладзены кампазіцыі аднаго з заснавальнікаў гурту В.Пучынскага.

Вялікі ўздым развіццю рок-музыкі ў краіне надало зняцце ідэалагічных бар'ераў, якія шкодзілі яе распаўсюджванню. З сярэдзіны 80-х гадоў у розных гарадах пачалі праходзіць шматлікія фестывалі і конкурсы рок-музыкі, якія дазволілі адкрыць новыя невядомыя імёны. Ствараюцца рок-клубы аматараў гэтага напрамку.

Далейшыя тэндэнцыі развіцця рок-музыкі звязаны найперш са з'яўленнем вялікай колькасці рок-гуртоў, якія выконваюць свае вакальныя кампазіцыі на беларускай мове. Напрыклад, «Бонда», «Мроя», «Уліс» і інш. Адны з першых гэта зрабілі музыкі рок-гурту «Сузор'е», якія ў 1985 г. стварылі рок-кампазіцыю па паэме М.Гусоўскага «Песня пра зубра». Таксама трэ-ба адзначыць і паступовы рост прафесійнага майстэр-ства выканаўцаў і аваладванне імі кампазіцыяй буй-ных музычных формаў. Асаблівая адметнасць гэтага перыяду -- наяўнасць розных напрамкаў рок-музыкі. З'явіліся гурты, якія выконваюць музыку ў стылі джаз-рока, панк-рока, арт-рока, фолк-рока і інш.

Для 80-х гадоў характэрна масавае распаўсюджванне рок-музыкі ў краіне. Гэта перыяд станаўлення і шырокага засваення стылістыкі рока, перыяд пачатку прафесійнага развіцця жанру.

Солапаў М.Р.,
прафесар

## АБ РАЗВІЦЦІ ТВОРЧАЙ АКТЫЎНАСЦІ СТУДЭНТАЎ МУЗЫЧНЫХ ВНУ Ў КАНТЭКСЦЕ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ МУЗЫЧНЫХ ТВОРАЎ

Праблема развіцця творчай дзейнасці студэнтаў застаецца яшчэ недастаткова даследаванай. Акрамя таго, у гэтай архіважнай для ўдасканалення музычнай педагогікі галіне дагэтуль дамінуе эмпірычны падыход. Навуковыя псіхолага-педагагічныя даследаванні творчай дзейнасці студэнтаў музычных ВНУ робяцца ўсё больш актуальнымі і інтэнсіўнымі. Асноўнымі працамі для музыкантаў-тэарэтыкаў і выканаўцаў, якія садзейнічаюць развіццю творчай актыўнасці, з'яўляюцца працы Б.Асаф'ева, Б.Яворскага. Вялікі ўклад унеслі сучасныя вучоныя, педагогі-музыканты розных нацыянальнасцей: Г.Нейгауз, І.Браўдо, Я.Назайкінскі, В.Медушэўскі, В.Бабраўскі, Ф.Арзаманаў, Г.Цыпін, Я.Яканюк і іншыя.

Творчая актыўнасць -- паняцце шматграннае, якое не зводзіцца да адназначных дэфініцый. У табліцы прыярытэтаў сучаснай музычнай педагогікі, акрамя вызначэння яе стратэгічнай мэты, раскрыцця асноўных тэндэнцый, на першае месца павінна быць пастаўлена інтэгруючае паняцце «актыўная творчая асоба». Усебаковае вывучэнне структуры якасцей студэнта-музыканта, г.зн. псіхалагічнага «пашпарта асобы»; развіццё самастойнага творчага мыслення, логікі навуковых і мастацкіх абгрунтаванняў сваіх меркаванняў у працэсе вывучэння музычнага твора; абуджэнне яркай эмацыянальнасці; пастаянны пошук новых спосабаў дзейнасці ў мастацкай практыцы; пазбяганне шаблонаў, стэрэатыпаў, штампаў у інтэрпрэтацыі, імкненне да самавыяўлення, самарэалізацыі -- адвечныя клопаты педагога-творцы, педагога-асобы.

Сучаснае мастацкае жыццё ставіць і іншыя важныя задачы: Рыхтаваць студэнтаў высокакваліфікаванымі спецыялістамі шырокага профілю, не



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

толькі музыкантамі-выканаўцамі, педагогамі, але і музычнымі дзеячамі-асветнікамі. Для гэтага неабходны: цэласны інтэгральны курс навучання; распрацоўка метадалогіі спецыяльных дысцыплін, звязанай з агульнатэарэтычнай метадалогіяй; ажыццяўленне міжпрадметных сувязей; выхаванне пачуцця абавязку, адказнасці перад яе Вялікасцю Музыкай.

Адной з к рдынальных праблем павышэння выканальніцкага майстэрства з'яўляецца методыка цэласнага аналізу, якая спалучае навукова-мастацкае асэнсаванне музычнага твора з элементамі творчасці. Перад студэнтам ставіцца задача – авалодаць музычным творам, глыбока і ўсебакова вывучыўшы яго, данесці да слухачоў у адэкватнай форме перажытае і асэнсавае.

У працэсе авалодвання творам педагог ставіць перад студэнтам праблему ў выглядзе катэгарыяльнай трыяды: тэкст – падтэкст – кантэкст. Галоўнае пры яе аналізе заключаецца ў вызначэнні дэтэрмінанты выканання – «генерыруючага прынцыпу» выканальніцкай інтэрпрэтацыі, накіраванага на творчае ўвасабленне выканальніцкіх сродкаў.

Вельмі важная роля ў працэсе развіцця творчай актыўнасці студэнтаў музычных ВНУ належыць такому глыбока індывідуальнаму працэсу жыццядзейнасці асобы, як самаактуалізацыя, калі праяўляюцца лепшыя бакі студэнта; ажыццяўляецца рэалізацыя самых каштоўных яго патэнцый і ўдасканаленне свайго духоўнага свету.

Побач з традыцыйнымі метадамі выхавання музыканта неабходна уводзіць комплексны метад, у якім істотная роля належыць, у першую чаргу, творчым дысцыплінам: навучанню імправізацыі, ігры па слыху, акампанементу, асновам развіцця тэматычнага матэрыялу (апрацоўкі, транскрыпцыі, пералажэнню), чытанню нот з ліста, транспанаванню. Альтэрнатывы комплекснаму метад няма. Выхаванне творчай самастойнасці студэнта ўнясе неабходныя карэктывы ў яго матывацыю пастаяннага павышэння прафесійнага майстэрства, зацікаўленасці, актывізуе пазнавальныя інтарэсы.

Растуноў А.Ц.,
докт. псіхал. навук,
прафесар

## ПСІХАЛАГІЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ ПРАФЕСІЙНАГА АДБОРУ СТУДЭНТАЎ У ШМАТУЗРОЎНЕВАЙ СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ КУЛЬТУРЫ

Аналіз сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў для на-роднай гаспадаркі, а таксама і для ўстаноў культуры Рэспублікі Беларусь паказвае, што прафесійная годнасць выпускнікоў ВНУ залежыць не толькі ад зместу і ўзроўню арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага складу, але і ад ступені адпаведнасці асобасных якасцей студэнтаў патрабаванням і ўмовам прафесійнага навучання і прафесійнай дзейнасці.

Аднабаковасць крытэрыяў адбору ў ВНУ, калі высновай для прыняцця рашэння аб залічэнні абітурыента з'яўляюцца толькі прахадны бал і адпаведнасць медыцынскіх паказчыкаў, нярэдка вядзе да таго, што студэнтамі становяцца асобы з няўстойлівай матывацыяй на будучую прафесію, недастатковымі здольнасцямі і схільнасцямі.

Шматгадовы аналіз набору студэнтаў у ВНУ Рэспублікі Беларусь паказвае, што на навучанне залічваюцца да 10--12% асоб без устойлівага і абгрунтаванага прафесійнага інтарэсу. Што датычыцца набору на спецыяльнасці ў галіне культуры, гэта лічба дасягае 15--17%. Толькі каля паловы гэтай групы студэнтаў вучацца на «добра» і «выдатна», астатнія не паспяваюць. Таму невыпадкова, што больш 20% з іх адлічаны з ВНУ па прафесійнай непрыгоднасці.

У працэсе ўступных экзаменаў не заўсёды адэкватна ўдаецца ацаніць схільнасці і здольнасці абітурыентаў, і ацэнкі па конкурсных дысцыплінах недастаткова адлюстроўваюць узровень здольнасцей да навук, якія з'яўляюцца базавымі для авалодання будучай прафесіяй.

Між тым аналіз дзейнасці маладых спецыялістаў у галіне культуры паказвае, што для многіх з іх характэрны нізкія прафесійная актыўнасць і прафесійная годнасць. Апошняе тлумачыцца недастатковай псіхалагічнай адпаведнасцю асобаснай структуры патрабаванням прафесійнай дзейнасці, што, па нашаму меркаванню, павінна выяўляцца пры адборы абітурыентаў у ВНУ і на пачатковых ступенях прафесійнага навучання.

Задача, такім чынам, заключаецца у распрацоўцы прыёмаў выяўлення прафесійна важных кампанентаў, якімі з'яўляюцца матывацыйныя і маральна-этычныя кампаненты, падрыхтаванасць, узровень развіцця пазнавальных працэсаў, эмацыянальна-валявая устой-лівасць, фізічныя даныя і адпаведныя медыцынскія паказчыкі.

Здольнасці да творчасці, арганізацыйныя, педагагічныя, як і іншыя псіхалагічныя характарыстыкі чалавека, у розных відах дзейнасці маюць розную значнасць. Таму самая пільная ўвага калектываў кафедраў, у асаблівасці прафілюючых, павінна быць звернута да вывучэння і прагназіравання асаблівасцей прафесійнай дзейнасці выпускнікоў і абгрунтавання прафесійных патрабаванняў да іх асобы, ацэнкі ўплыву пэўных асабасных якасцей на эфектыўнасць дзейнасці ў цэлым.

Вынікі праведзенага эксперымента, а таксама матэрыялы нашых шматгадовых даследаванняў па праблеме дазваляюць зрабіць заключэнне, што з пераходам да шматузроўневай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў неабходна пастунова ажыццяўляць пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ